# ***Раман Якубавіч Тармола - Мірскі — беларускі паэт, сцэнарыст.***



## Біяграфія

Будучы паэт нарадзіўся ў сям'і рамесніка. У 1960 г. скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута. Працаваў старшым рэдактарам, загадчыкам літаратурна-мастацкага аддзела, галоўным рэдактарам літаратурна-драматычных праграм, каментатарам па літаратуры і мастацтву Беларускага тэлебачання. З 1977 г. сябра сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі мастацкіх фільмаў кінастудыі «Беларусьфільм», з 1980 г. — сябра сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі тэлевізійных фільмаў Беларускага тэлебачання. Памёр у чэрвені 2011 г. Пахаваны ў г. п. Мір.

# Творчасць

Першыя творы апублікаваў у 1957 г. («Настаўніцкая газета», «Чырвоная змена»). Аўтар кніг паэзіі «Асколкі і росы» (1964), «Поўня» (1966), «Абнаўленне» (1968), «Міранка» (1971), «Побач» (1974), «Павага» (1976), «Зямное — зямному» (выбранае, 1979), «Вобразы вечара» (1982), «Толькі б дагаварыць» (1986), «Спрадвечнасць» (выбранае, 1989). Выдаў кнігі для дзяцей «Каго баяцца ў лесе» (1973), «Казкі-падказкі» (1984). Напісаў сцэнарыі дакументальных фільмаў «Людзям сябе пакажы» (зняты ў 1973), «Я не самотны… Максім Багдановіч» (зняты ў 1982 г.), тэлеспектакля «Зачараваны Валерка» (пастаўлены ў 1976 г.). У 2000-м годзе выйшаў у свет апошні зборнік паэзіі «Прычасце».









## *Спёка*

Бульбоўнік вяне ў полі — спёка.
Ручай, бы цень, бяжыць маўкліва.
І нават дрэвы з-пад аблокаў
Глядзяць панура і санліва.

А жыта узнімае голаў,
Блішчыць на сонцы зернем ліпкім,
Траскочуць конікі наўкола,
І колас грае першай скрыпкай...

1964

* * *

Жыццё распісвае па нотах
І захапленне і тугу.
Баюся шумнай адзіноты
І са сціхотнай не магу.

І неймаверная патрэба
Сяброўства — па зямлі вядзе.
І з рук маіх у наша неба
Хай выпырхне шчаслівы дзень.

1966

## *Часцей бы нам...*

Дабро зрабіць бы і забыць,
Што некаму яго зрабілі.
І чэрствасць у сабе забіць,
Пакуль там чуласць не забілі.

Пасля хадзіць у дзіваках,
Пацешных, неспрактыкаваных.
І лёс трымаць не ў кулаках —
У позірках непрыхаваных.

1980

* * *

У павучальнікі не лезу я.
І ты сабрата не кляні:
Святло запальвае паэзія
Не кожны раз, не ў кожным дні.

Душа радкоў незразумелая
Яе стваральніку парой...
І баязлівая, і смелая
Вядзе праз чалавечы строй.

1980



# ПРА КНІЖКУ, ЦІШКУ І МЯДЗВЕДЗЯ МІШКУ

Жыла-была кніжка.
А ў кніжцы той — казка.
А ў казцы — быў Мішка,
І рэчка, і краскі.
Жылі ў ёй ласі
І ваўкі, як суседзі.
Ды болей за ўсіх
Мы любілі мядзведзя.
На кожнай старонцы
Мішутка то дрэмле,
То скача пад сонцам,
То лазіць па дрэве.
То вулей пчаліны
Ён цягне у лес,
А то — па маліны
У сад ён залез.
То разам з братамі
Частуецца мёдам...
Мы кніжку гарталі

З такой асалодай.
Мы столькі разоў
Перачытвалі кніжку
Пра лютых ваўкоў
І пра добрага Мішку,
Што вочы заплюшчыш —
І бачыш заўжды,
Куды ён пабег
І схаваўся куды.
Ніхто і не думаў,
Ніхто не гадаў,
Што нас падпільноўвае
Гора, бяда.
Што нашую кніжку
І нашага Мішку
Даўно запрыкмеціў
Задзірысты Цішка.
І вось дзён праз пяць
Заявіўся, ілжывы.
— Далі б пачытаць,—
Папрасіў ён пачціва.
Хіба мы жадзюгі?
З вясёлым настроем,
Бяры, кажам другу,
Чытай на здароўе.
Адкуль было ведаць,
Адкуль было знаць,
Што Цішка не ўмее
Пісаць і чытаць.
Што ён, як Сярожа
І хітры Гарон,
Лічыць адно можа —
У небе варон.
Мінае дзень першы,
А кніжкі няма,
Ды нехта суцешыў,
Гаворыць: «Дарма...
Дарма хвалявацца,
Ён кніжку не з'еў,
Відаць, прачытаць
Цімафей не паспеў».
І ўсе мы падумалі
Так пра яго.
І весела, дружна
На рэчку — бягом.
А потым да ночы
Гулялі ў футбол,
І нас не бянтэжыў
Прапушчаны гол.
Адкуль было ведаць,
Адкуль было знаць,
Што Цішка не ўмее
Пісаць і чытаць.
Што ён, як Сярожа
І хітры Гарон,
Лічыць адно можа —
У небе варон.
Але і ў канцы
Наступнага дня
Ад Цішкі прыбегла
Адна цішыня:
Сяброў ён не клікаў
Гуляць у двары
І нават варон
Не лічыў угары.
І толькі на трэці,
На трэці аж дзень!
Валерка прыкмеціў:
Цішка ідзе!
І Пеця, і Рыта,
Глядзіце вы ўсе!
— Ён нейкі сярдзіты...
— І кніжку нясе!
— З ім доўгі Сярожа
І тоўсты Гарон.
— Чытаў нашу кніжку,
Відаць, ім Ціхон.
— Вядома, чытаў,
Бо выгляд які —
Ідуць, як надзьмутыя
Індыкі.
— Ну што, грамацеі,—
Прамовіў Ціхон,—
Відаць, хваляваліся



Некалькі дзён!
Гадалі — я з'ем
Вашу кніжку ці не...
Вазьміце... Яна
Не патрэбна больш мне...
Звычайная кніжка.
Адолеў ледзь-ледзь.
У ёй жа няма
На каго паглядзець...
— Няма на каго?
А ласі!
— А мядзведзь!
— А тыгр і вавёрка!
— А столькі ваўкоў! —
Мы Цішку гуртом
Абступілі з бакоў.
І тут як пабег
Забіяка Ціхон.
А следам Сярожа
І хітры Гарон.
І нашыя крыкі
Ім наўздагон...
Мы кнігу адкрылі,
Гарталі... О жах!
З'явіліся слёзы
Ва ўсіх на вачах:
Ёсць воўк, і лісіца,
І тыгр, і ўдаў,
Мядзведзя няма —
Наш Мішутка прапаў.
Не лазіць па дрэве,
Не скача пад сонцам



І нават не дрэмле
На пятай старонцы.
Не стала малюнкаў
З мядзведзем-гарэзам:
Задзіра, манюка
Ціхон павырэзваў.
Я плакаў...
І плакала горка сястрычка...
Аж капалі слёзы
Ёй на спаднічку.
Ад гэтага —
Стала спаднічка ў гарошак...
— Дзяцей сустракаў я
Нямала харошых!
Такіх вось, як вы,—
Дык не вельмі і многа,—
Пачуўся тут голас
Мядзведзя старога.—
Таму я насуперак
Гэтаму Цішку
З ахвотаю, дзеці,
Вяртаюся ў кніжку.
Цяпер паглядзім,—
Зароў Мішка строга,—
Хто прыйдзе з нажніцамі
Да такога
Мядзведзя.
А дзе гэта было?
Недзе...
А з кім так было?
Падумайце самі.
Мабыць, са мной...
Мабыць, з вамі?